# «ЛіМ»-акцэнты

**Віншаванне.** Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў суайчыннікаў з Днём народнага адзінства. «Гэта свята гістарычнай справядлівасці, што сімвалізуе нацыянальнае адраджэнне Беларусі, — адзначыў Кіраўнік дзяржавы. — 17 верасня 1939 года ажыццявілася адвечнае імкненне беларусаў жыць на сваёй тэрыторыі адзінай сям'ёй у міры і згодзе. З тых часоў мы засвоілі ісціну: каб заставацца незалежнымі, трэба быць моцнымі эканамічна, палітычна і духоўна». У віншаванні таксама гаворыцца, што сёння, калі краіна развіваецца і ўпэўнена ідзе наперад, асабліва важна беражліва захоўваць у сэрцах любоў і павагу да роднай зямлі. «Толькі так, агульнымі намаганнямі, мы зможам перадаць нашчадкам гордае права беларусамі звацца», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

● Кіраўнік дзяржавы павіншаваў Мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Веніяміна, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі, з днём нараджэння. «Праваслаўная Царква адыгрывае важную ролю ў падтрыманні міжканфесійнай згоды ў нашай краіне. Сваім архіпастырскім служэннем і малітвамі вы ўносіце вялікі ўклад у захаванне і прымнажэнне маральных і культурна-гістарычных каштоўнасцей на беларускай зямлі, — гаворыцца ў віншаванні. — Ваша асабістая адкрытасць да дыялогу з людзьмі розных пакаленняў, прынцыпаў і перакананняў дапамагае кожнаму чалавеку адчуць бацькоўскі клопат і падтрымку ў цяжкую хвіліну».

**Свята.** Выставачны праект, прымеркаваны да 85-годдзя ўз'яднання беларускага народа, адкрыўся ў Нацыянальным гістарычным музеі. «Дзяржаўнае свята — Дзень народнага адзінства — служыць аб'ектыўным напамінам аб самадастатковасці беларускай нацыі і непахіснасці беларускай дзяржаўнасці, сімвалізуе пераемнасць усіх пакаленняў беларускага народа, фарміруе пачуццё датычнасці кожнага грамадзяніна да лёсу краіны і ўмацоўвае згуртаванасць грамадства на шляху пабудовы моцнай, суверэннай і квітнеючай Беларусі», — адзначаюць арганізатары. Новы праект падрыхтаваны НГМ у рамках Гранта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь сумесна з Уладзімірам Ліхадзедавым.

**Спадчына.** Прэзентацыя 2-га тома Збору твораў Кузьмы Чорнага ў 12 тамах прайшла днямі ў Інстытуце літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. У кнігу ўвайшлі апавяданні 1926—1931 гадоў, якія друкуюцца ў адпаведнасці з апошняй творчай воляй аўтара, навуковыя каментарыі (гісторыка-літаратурны, тэксталагічны, рэальны), моўныя варыянты і разначытанні, якія адлюстроўваюць непасрэдную працу Кузьмы Чорнага над творамі. У тэкстах узноўлена мова пісьменніка, адлюстраваны дыялекталагічныя асаблівасці лексічных адзінак і іх граматычных форм.

**Праект.** Выстаўка «Ракурсы творчасці» да 85-годдзя з дня нараджэння оперная спявачкі, народнай артысткі Беларусі Святланы Данілюк адкрыецца 25 верасня ў філіяле «Музей гісторыі тэатральнай і музычнай культуры» Нацыянальнага гістарычнага музея. У экспазіцыі будуць прадстаўлены матэрыялы з фондаў музея: сцэнічныя касцюмы артысткі, афішы, фотаздымкі сцэн са спектакляў з удзелам Святланы Піліпаўны. Творчая індывідуальнасць артысткі яскрава выяўлялася ў партыях драматычнага плана: Любаша («Царская нявеста» М. Рымскага-Корсакава), Кармэн («Кармэн» Ж. Бізэ). Выступала і ў нацыянальных операх, сярод якіх — Алеся («Алеся» Я. Цікоцкага), Вераніка («Зорка Венера» Ю. Семянякі) і іншых.

**Фестываль.** Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры запрашае заўтра на літаратурна-музычны фестываль «Восень у Завоссі», які пройдзе ў філіяле «Музей-сядзіба Міцкевічаў "Завоссе"». Мерапрыемства ладзіцца сумесна з Баранавіцкім раённым выканаўчым камітэтам пры ўдзеле Саюза пісьменнікаў Беларусі. Гасцей чакаюць экскурсіі па сядзібе, канцэртная праграма, выступленні літаратараў, інтэрактыўныя пляцоўкі, выстаўкі, квэсты, гульні, майстар-класы і фотазоны. Так, запланаваны лекцыя даследчыка-архівіста Змітра Юркевіча, сустрэча «Міцкевіч як апокрыф: нечаканае падарожжа» вядучага навуковага супрацоўніка Інстытута філасофіі НАН Беларусі Ігара Бабкова, выступленне спецыяльных музычных гасцей — народнага фальклорнага ансамбля «Сарматы» і Ільі Шынкарэнкі.

● Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы разам са Студэнцкім этнаграфічным таварыствам запрашаюць у нядзелю ў Купалаўскі мемарыяльны запаведнік «Вязынка», дзе адбудзецца восеньскі фэст традыцыйнай культуры «Багач». У праграме свята — урачысты абрад ссыпання зерня і запальвання агню, дажынкавыя і восеньскія спевы з розных рэгіёнаў Беларусі, майстар-класы па рамёствах, кірмаш, традыцыйныя танцы.

***Агляд афіцыйных падзей ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ***